**5.** Ахарактарызуйце эканамічнае становішча Кітая пасля правядзення эксперыментаў у ходзе «вялікага скачка» і «культурнай рэвалюцыі».



**Маа Цзэдун** (1893—1976) — дзяржаўны і палітычны дзеяч Кітая. Адзін з заснавальнікаў КПК, старшыня ЦК КПК з 1943 г. Скончыў педагагічнае вучылішча, працаваў у бібліятэцы Пекінскага ўніверсітэта. Адыграў вялікую ролю ў барацьбе супраць Гаміньдана і ў працэсе ўтварэння КНР. Пасля ўтварэння КНР узначальваў урад краіны. Маа лічыў, што ўзброеная барацьба, тэрор і насілле маюць вырашальнае значэнне ў гісторыі. Такімі метадамі ён імкнуўся як хутчэй пабудаваць сацыялізм і камунізм у Кітаі. Маа лічыў, што класавыя супярэчнасці абвастраюцца ў ходзе будаўніцтва сацыялізму, таму вёў пастаянную ідэалагічную барацьбу супраць сваіх апанентаў. Ён быў таксама прыхільнікам кітайскага нацыяналізму, настойліва падкрэсліваў вядучую ролю кітайскай нацыі ў ходзе рэвалюцыйнага пераўтварэння свету.



# § 41. Кітайская Народная Рэспубліка

*1. Ці быў дасягнуты рэзкі ўздым эканомікі Кітая ў ходзе «вялікага скачка»? 2. Чаму ў працэсе «культурнай рэвалюцыі» зведалі ганенні ў першую чаргу высокапастаўленыя чыноўнікі, вядомыя вучоныя, студэнты?*

Пасля смерці Маа Цзэдуна ў навейшай гісторыі Кітая настала новая эпоха. Пачаўся працэс рэфармавання кітайскага грамадства. У аснову пераўтварэнняў былі пакладзены пераход да рыначнай эканомікі.

**Кітай пасля смерці Маа Цзэдуна.** Маа Цзэдун пакінуў пасля сябе краіну ў стане вострага крызісу. Нават паводле афіцыйных звестак у КНР налічвалася 20 млн поўнасцю беспрацоўных і 8 млн асоб, якія «шукалі» працу, 100 млн чалавек галадала. Асноўныя прадукты харчавання і нехарчовыя тавары размяркоўваліся па картках.

ХІ з’езд КПК, што адбыўся ў жніўні 1977 г., афіцыйна абвясціў аб завяршэнні «культурнай рэвалюцыі». ***Дэн Сяапін*** быў абраны на пасады намесніка Прэм’ера Дзяржсавета і намесніка старшыні ЦК КПК. Ён быў ініцыятарам і галоўным ідэолагам рэформаў, якія змянілі выгляд Кітая, самым уплывовым палітычным дзеячам, не займаючы першых пасад у партыі і дзяржаве.

**Рэфармаванне сацыялістычнага грамадства.** Яшчэ ў перыяд «культурнай рэвалюцыі» Дэн Сяапін прапанаваў ідэю *«чатырох мадэрнізацый»*, г. зн. вывесці на сучасны ўзровень прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і арміі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Дэн Сяапін крытычна ставіўся да тых палітыкаў, якія дагматычна змагаліся за «чысціню ідэй сацыялізму». Вядомая яго крылатая фраза: «Не мае значэння, якога колеру кот — чорнага ці белага. Абы ён лавіў мышэй». У снежні 1978 г. па яго ініцыятыве было прынята рашэнне аб правядзенні ў КНР буйнамаштабнай эканамічнай рэформы ў мэтах пабудовы ў краіне «сацыялізму з кітайскай спецыфікай».

У наступным годзе Дэн Сяапін сфармуляваў «чатыры прынцыпы» рэформаў, якія ўвайшлі ў абноўленую Канстытуцыю КНР 1982 г.: прытрымлівацца сацыялістычнага шляху, дыктатуры пралетарыяту, кіроўнай ролі кампартыі, марксізму-ленінізму і ідэй Маа Цзэдуна.

Асаблівасць эканамічных рэформаў была ў тым, што спачатку яны праводзіліся ў сельскай гаспадарцы і толькі затым ахапілі прамысловую сферу.

Рэформы ў сельскай гаспадарцы пачаліся ў *канцы 1970-х гг.* Іх адметнай асаблівасцю стала паступовая адмова дзяржавы ад умяшання ў працэс вытворчасці і збыту прадукцыі. Істотна пераглядаліся, а часам і зусім здымаліся планавыя заданні. Шырокае распаўсюджанне атрымаў сямейны падрад. Зямля перадавалася на дагаворных пачатках сялянам, якія свабодна распараджаліся вынікамі сваёй працы пасля выплаты падатку дзяржаве. Павышаліся закупачныя цэны, уводзіліся свабодныя цэны на сельгаспрадукцыю. У асабістую ўласнасць сялян пераходзіла сельскагаспадарчая тэхніка.

Рэзкае стымуляванне сялянскай працы прывяло да хуткага росту прадукцыі сельскай гаспадаркі. У 1984 г. ураджай збожжавых склаў 400 млн т — у два разы болей, чым у 1958 г. У сярэдзіне 1990-х гг. вырошчвалі ўжо 450 млн т збожжа ў год. Гэтага было дастаткова, каб задаволіць гіганцкія патрэбы ў прадуктах харчавання насельніцтва, што ўсё расло. Маючы толькі 7 % сусветных ворных зямель, Кітай мусіў пракарміць 21 % насельніцтва Зямлі. Больш за тое, КНР ператваралася з імпарцёра збожжа ў яго экспарцёра. Поспех быў настолькі значны і відавочны, што вельмі здзівіў увесь свет.

У *1984 г.* пачалі праводзіцца рэформы ў прамысловасці. У ходзе іх спынілася практыка ўмяшання адміністрацыйных і партыйных органаў у дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў, адмянялася абавязковае да таго дырэктыўнае планаванне. Прадпрыемствы пераводзіліся на гаспадарчы разлік, ім даваліся шырокія правы. У краіне дазвалялася прыватнапрадпрымальніцкая дзейнасць, дзяржава ўсяляк заахвочвала развіццё дробнага і сярэдняга бізнесу. Стала магчымым стварэнне сумесных прадпрыемстваў і свабодных эканамічных зон з удзелам замежнага капіталу. У прамысловасць рынуліся патокам замежныя інвестыцыі.

Сярэднегадавы прырост ВУП у 1991—1995 гг. склаў 12 %. Да 2000 г. планавалася павелічэнне ВУП у 4 разы, але гэты вынік быў дасягнуты ўжо ў 1995 г. У канцы XX ст. даход на душу насельніцтва павялічыўся да 840 долараў. З цягам часу Кітай ператварыўся ў другую сусветную эканоміку па аб’ёме ВУП.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Пратэсты на плошчы Цяньаньмэнь. 1989 г.

Эканамічныя рэформы ў Кітаі ажыццяўляліся ў цеснай сувязі з рэфармаваннем палітычнай сістэмы. У 1981 г. на пленуме ЦК КПК былі асуджаны культ асобы Маа Цзэдуна, палітыка «вялікага скачка», «культурная рэвалюцыя». У той жа час падкрэслівалася, што заслугі памерлага правадыра перад партыяй і дзяржавай «займаюць галоўнае, а памылкі — другараднае месца».

З сярэдзіны 1980-х гг., ва ўмовах укаранення элементаў рыначнай эканомікі, у кітайскім грамадстве пачалі нарастаць дэмакратычныя тэндэнцыі. Студэнцтва, інтэлігенцыя, многія рабочыя патрабавалі лібералізацыі палітычнай сістэмы, сапраўднай шматпартыйнасці, захавання асноўных правоў чалавека. У шэрагу гарадоў Кітая прайшлі выступленні студэнтаў і нават сутыкненні з уладамі. Узмацніліся рознагалоссі ўнутры кіраўніцтва партыі і дзяржавы.

Вясной *1989 г.* незадаволенасць адсутнасцю палітычных свабод вылілася ў мільённыя мітынгі ў Шанхаі, Нанкіне і іншых гарадах. На цэнтральнай плошчы Пекіна *Цяньаньмэнь* бесперапынна праходзілі мітынгі студэнтаў. У сталіцы было ўведзена ваеннае становішча, а ў чэрвені супраць дэманстрантаў былі накіраваны танкі і бронемашыны. 9 красавіка на плошчы Цяньаньмэнь пралілася кроў, былі шматлікія чалавечыя ахвяры. Кіраўніцтва КПК расцаніла выступленні студэнтаў як «контррэвалюцыйны бунт». У 1992 г. на XIV з’ездзе КПК была канчаткова вызначана афіцыйная сацыяльна-эканамічная мэта рэформаў — будаўніцтва «сацыялістычнай рыначнай эканомікі».

Смерць Дэн Сяапіна ў 1997 г. не змяніла курсу рэформаў. Кіраўніцтва КНР вынесла ўрокі з падзей 1989 г., развалу СССР і змен, што адбыліся ў краінах Усходняй Еўропы. Яно прытрымлівалася палітыкі кампрамісу і старалася арыентавацца на ўсе пласты кітайскага грамадства, а таксама рашуча вызваляла эканоміку ад кантролю з боку дзяржавы.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Сі Цзіньпін

Новае пакаленне лідараў КНР не было схільнае крытыкаваць былых кіраўнікоў. Яно клапацілася ў першую чаргу пра рух краіны наперад. Пры *Ху Цзіньтаа* прадпрымальнікам дазволілі ўступаць у камуністычную партыю. Рэфарматарскага курсу прытрымліваецца і цяперашні лідар КНР ***Сі Цзіньпін***.

**Знешняя палітыка КНР.** Знешняя палітыка Кітая ў другой палове XX — пачатку XXI ст. зведала значныя змены. У 1950-я гг. яна вызначалася ў цэлым дружалюбнымі адносінамі з СССР. Пераломным стаў 1956 г., калі ў СССР быў асуджаны культ асобы Сталіна. Савецкае кіраўніцтва агучыла на міжнароднай арэне ідэю «мірнага суіснавання» з Захадам, і перш за ўсё з ЗША, якія ўпарта не прызнавалі КНР і падтрымлівалі Тайвань. Гэта ідэя не адпавядала палітычнай лініі Маа Цзэдуна, які баяўся «змовы» дзвюх звышдзяржаў супраць Кітая.

У 1960-я гг. савецка-кітайскія адносіны былі поўнасцю згорнуты. КНР спрабавала сфарміраваць на міжнароднай арэне з краін, што сталі на шлях развіцця, групоўку дзяржаў пад сваёй эгідай. Але гэта спроба не мела поспеху. Недавер да кітайскага кіраўніцтва спараджалі ўзброеныя канфлікты Кітая з суседзямі.

Пэўную выгаду КНР змагла атрымаць з савецка-амерыканскага процiборства. У 1970 г. пачалося збліжэнне паміж Кітаем і ЗША, якія, у сваю чаргу, хацелі скарыстацца ў сваіх мэтах рознагалоссямі паміж КНР і СССР. ЗША далі згоду на вяртанне кантынентальнага Кітая ў ААН замест Тайваня. КНР стала пастаянным членам Савета Бяспекі ААН.

Пасля 1985 г. пачалася нармалізацыя савецка-кітайскіх адносін. Да сярэдзіны 1990-х гг. склаліся партнёрскія адносіны паміж КНР і пераемніцай СССР Расіяй. Былі ўрэгуляваны пагранічныя праблемы. Намаганнямі Кітая і Расіі была створана *Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва* (2001). У наступныя гады ўсё больш і больш умацоўваліся дружалюбныя адносіны паміж гэтымі краінамі.



Дэн Сяапін на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр у Пекіне 19 снежня 1984 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Сфарміраваліся ўстойлівыя партнёрскія адносіны паміж КНР і Рэспублікай Беларусь. Рэгулярнымі сталі сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі з вышэйшым кіраўніцтвам КНР. Адначасова Пекін умацоўваў адносіны з ЗША і іншымі краінамі Захаду.

У 1997 г. у склад КНР быў вернуты Сянган, або Ганконг, а ў 1999 г. — Аамынь, або Макаа. Аднак так і засталіся не ўрэгуляванымі адносіны з Тайванем. Кіраўніцтва КНР прытрымліваецца формулы «адна дзяржава — дзве сістэмы» і імкнецца прымусіць тайваньцаў увайсці ў склад КНР. Большасць краін свету прызнае, што існуе адзін Кітай і ўрад КНР з'яўляецца адзіным яго законным прадстаўніком.

Такім чынам, кітайская «перабудова», якая пачалася на шэсць гадоў раней за савецкую, у выніку не прывяла да негатыўных наступстваў.

1. Параўнайце план «чатырох мадэрнізацый» з палітыкай «вялікага скачка». У чым заключалася іх прынцыповае адрозненне? У чым, на вашу думку, сакрэт поспеху праведзеных рэформаў?
2. Растлумачце сутнасць «сацыялізму з кітайскай спецыфікай».
3. Чаму ў другой палове 1980-х гг. насельніцтва Кітая стала патрабаваць дэмакратызацыі палітычнай сістэмы?
4. Вызначце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Кітая цяпер. Растлумачце сэнс палітыкі «адна дзяржава — дзве сістэмы».
5. Якія дасягненні сучаснага Кітая? Што, на вашу думку, дало магчымасць дабіцца станоўчых вынікаў?
6. Складзіце палітычны партрэт Дэн Сяапіна.

Ці можна разглядаць Кітай як прыклад дзяржавы, у якой пры захаванні моцнай палітычнай улады фактычна пабудавана і дзейнічае рынкавая эканоміка?

**З даклада Старшыні КНР Цзян Цзэміна на XVI Усекітайскім з'ездзе КПК. 8 лістапада 2002 г.**

На аснове структурнай аптымізацыі і павышэння эфектыўнасці пастарацца павялічыць да 2020 г. валавы ўнутраны прадукт у чатыры разы супраць 2000 г., значна ўзмацніць сукупную магутнасць краіны і нашу міжнародную канкурэнтаздольнасць. Ажыццявіць у асноўным індустрыялізацыю, стварыць дасканалую сістэму сацыялістычнай рынкавай эканомікі і больш жыццядзейную і адкрытую эканамічную сістэму. Значна падняць удзельную вагу гарадскога насельніцтва і паступова ліквідаваць тэндэнцыю да павелічэння адрозненняў паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, горадам і вёскай, асобнымі рэгіёнамі. Зрабіць больш дасканалай сістэму сацзабеспячэння і больш поўнай грамадскую занятасць, паўсюль прымножыць сямейную маёмасць і забяспечыць народу больш заможнае жыццё.

*Якія задачы былі пастаўлены перад партыяй і краінай на бліжэйшае дваццацігоддзе?*

Правообладатель Издательский центр БГУ